# *§ 36–0. Рэфармацыя. Рэлігійныя войны ў Заходняй Еўропе. Контррэфармацыя

**1. Ордэн езуітаў і яго дзейнасць на тэрыторыі ВКЛ.** Галоўнай зброяй у барацьбе супраць пратэстантаў стаў каталіцкі манаскі ордэн езуітаў (Таварыства Ісуса, або Ордэн св. Ігнація), заснаваны ў 1534 г. Ігнаціем Лаёлам. Праз шэсць гадоў Папа Рымскі Павел III зацвердзіў статут Таварыства Ісуса.



*Зацвярджэнне статута Таварыства Ісуса. Фрэска. 1743 г.*

Ордэн ад самага пачатку будаваўся на непарушнай іерархіі і дысцыпліне, беспярэчным падпарадкаванні кіраўнікам ордэна. Яго сябры апроч трох традыцыйных абяцанняў (беднасці, паслушэнства і цноты) давалі і чацвёртае — паслушэнства Папу Рымскаму «ў пытаннях місій». Езуіты атрымлівалі ўсебаковую падрыхтоўку. Яны былі добра адукаваныя, неверагодна спрытныя і цярплівыя, не грэбавалі нават чорнай працай. Вялікае значэнне надавалася выхаванню новага пакалення. Імкнучыся павялічыць колькасць прыхільнікаў, езуіты адкрывалі свае навучальныя ўстановы. У XVI ст. езуіты замацаваліся не толькі ў Еўропе, але і ў Індыі, Японіі, Кітаі, на Філіпінах. Яны з’явіліся ў Афрыцы, Паўднёвай Амерыцы, Азіі.

У 1569 г. у Вільню на запрашэнне віленскага біскупа Валяр’яна Пратасевіча прыехалі першыя 13 езуітаў, што зрабіліся асноўнымі праваднікамі Контррэфармацыі. Аднак у час праўлення Жыгімонта II Аўгуста, рэлігійныя погляды якога вылучаліся верацярпімасцю, дзейнасць езуітаў яшчэ не набыла значнага размаху.

Асноўную стаўку езуіты зрабілі на выхаванне моладзі праз адукацыю. У 1570 г. была адкрытая першая езуіцкая школа, у 1579 г. — Віленская езуіцкая акадэмія, праз год — езуіцкі калегіум у Полацку, а ў 1585 г. — у Нясвіжы. Свае казані яны часцяком

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Урывак з кнігі І. Лаёлы «Духоўныя практыкаванні»**

«Неабходна, каб вера ў Бога была настолькі вялікая, каб чалавек, не вагаючыся, рушыў у мора на дошцы, нават не маючы карабля! Калі царква сцвярджае, што тое, што нам здаецца белым, насамрэч чорнае, — мы мусім адразу прызнаць гэта!.. Калі мы не знаходзім у святарах і іншых царкоўных начальніках чысціні нораваў, якую жадаем пабачыць, мы зусім не павінны вінаваціць іх за гэта, бо такімі размовамі спараджаецца болей шкоды і ганьбы, чым карысці, бо вынікам іх будуць злосць і пагарда народа супраць сваіх начальнікаў і пастыраў».

1. *Якія аргументы за веру ў Бога прыведзены ў дакуменце?*
2. *Які падыход прапануе аўтар да вырашэння праблемы неадпаведнасці паміж спадзяваннямі грамадства і паводзінамі служак царквы?*



*Калегіум езуітаў. Г. Орша. Сучасны выгляд*

прамаўлялі на беларускай мове, на ёй жа вялося выкладанне ў Полацкім калегіуме. Езуіты імкнуліся да поўнай манаполіі ў адукацыі, выцясняючы кальвінісцкія, арыянскія і праваслаўныя брацкія школы. Езуіцкая адукацыя, якую атрымлівалі ў калегіумах Брэста, Пінска, Навагрудка, Гародні, Менска, Віцебска, Слуцка, Магілёва, вылучалася высокім узроўнем. Тут маглі вучыцца дзеці, што належалі да розных канфесій. На выхадзе ўсе яны рабіліся шчырымі прыхільнікамі каталіцтва. Пры езуіцкіх калегіумах ствараліся тэатры, бібліятэкі.

Езуіты актыўна займаліся выдавецкаю справай. Тыпаграфіі ордэна былі заснаваны ў Вільні, Нясвіжы, Пінску. Важнае значэнне езуіты надавалі дабрачыннай дзейнасці, арганізоўвалі прытулкі і бальніцы. На беларускую мову перакладаліся свяшчэнныя кнігі.

Пазіцыі езуітаў у ВКЛ у XVII — першай палове XVIII ст. былі досыць трывалыя. У 1608 г. была створана асобная Літоўская правінцыя ордэна, куды ўвайшла ўся Беларусь і сумежныя тэрыторыі. Да пачатку 1770-х гг. езуітам у ВКЛ належалі велізарныя зямельныя ўладанні. Вядомымі сябрамі ордэна былі першы

рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі П. Скарга, астраном М. Пачобут-Адляніцкі, філосаф М. Сміглецкі.

Пад уплывам ідэй эпохі Асветніцтва стаўленне кіруючых колаў Рэчы Паспалітай да ордэна пагоршылася. У 1773 г. Папа Рымскі Клімент XIV скасаваў ордэн езуітаў. Маёмасць іх адукацыйных устаноў у ВКЛ перайшла да Эдукацыйнай камісіі, якая стварала на іх базе свецкія школы.

Аднак на частцы тэрыторыі Беларусі, якая пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай зрабілася часткай Расійскай імперыі, ордэн езуітаў працягнуў сваё існаванне. Полацкі езуіцкі калегіум у 1812 г. нават атрымаў статус акадэміі. У 1820 г. ордэн езуітаў быў забаронены на тэрыторыі Расійскай імперыі.

1. Ахарактарызуйце дзейнасць езуітаў на тэрыторыі ВКЛ.
2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, вызначце ключавыя прынцыпы і падыходы езуіцкай сістэмы адукацыі.